ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Віцебскі Пралетары

ЗАГАДОВЕНАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

Кошт нум.— 5 кап.

№ 254

СЕРАДА 18 ЛІСТАПАДА 1931 г.

Год выданьня XIV.

Минск, Советская 5, ред. газ. "Звязда" 3 экз.

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ БАРАЦЬБЫ ЗА РАЗГОРТВАНЬНЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ

Раўнаючыся па раёнах, датэрмінова выканаўшых плян камплектаваньня,

АРГАНІЗАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА РАЁНУ ПАВІННЫ ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ У АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНІ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ

Выканаць пляны разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі

Развязваньню жывёлагадоўчай праблемы ...ныя надае сугуба важнае палітычнае зна...не. «Стварэньне і ўмацаваньне буйной аграканай гаспадаркі па жывёлагадоўлі» зьяўца адзіным выйсьцём і лепшым сродкам ...пяховага развязваньня гэтай праблемы.

Адозва ЦК і СНК аб разьвіцьці сацыялі...най жывёлагадоўлі дала разгорнутую пра...у бальшавіцкіх дзеяў у стварэньні новых ...р, арганізацыі малочна-таварнага стада па ...гасах і калгасах, забесьпячэньню жывёлы ...амі і памяшканьнямі. Правядзеньне мера...емстваў адозвы ў жыцьцё азначае новы ...м калгасный вытворчасьці, яшчэ большае ...цаваньне калгасных дасягненьняў.

У пляне гэтых работ будаўніцтва МТФ мае ...лючнае гаспадарча-палітычнае значэньне, бо ...очна-таварныя фэрмы зьяўляюцца найлеп...і мэтадам уцягненьня шырокіх калгасных ...у будаўніцтва буйных аграмаджаных жы...гадоўчых гаспадарак.

У абвешчаны ЦК КП(б)Б двухмесячнік раз...ваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі ўклю...ся і Віцебскі раён. Гарсавет і райкалгас...з намецілі плян, дзе значылася: павялічэнь...стада па калгасах з 3847 галоў прадукцый...рагатай жывёлы да 4269 да канца двухме...ніку, цялят з 1037—да 2000, сьвіньней з ...да 850 галоў. Плянам таксама намячалася ...нізацыя 30 МТФ з павялічэньнем стада да ...2 галоў, замест меўшыхся да пачатку двух...ячніку 1852. Па каапгасах намячалася па...чэньне стада да 3000 галоў.

Склаўшы плян, кіруючыя арганізацыі, як ...авет і райкалгассаюз, асноўнага не зрабілі. ...не забясьпечылі канкрэтнага апэрацыйнага ...ўніцтва нізавымі зьвенямі савецкага і кал...гага апарату, у выніку чаго ганебнае, зусім ...рнае выкананьне пляну, як камплектаваньне стада, гэтак і будаўніцтва скотнікаў.

У той час, як перадавыя раёны Беларусі ...ачоўскі, Лёзьненскі, Сіроцінскі і інш.) пляны ...плектаваньня малочна-таварных калгасных ...маў выканалі датэрмінова, адзначылі скан...не двухмесячніку жывёлагадоўлі буйнейшымі ...амогамі, Віцебскі ж раён знаходзіцца ў ...ьцо, ганебна адстаючы.

Досыць паказаць на ход камплектаваньня ...а па каапгасах і калгасах, каб упэўніцца ва ...бязьдзейнасьці, безадказнасьці, гарсавету ...йкалгассаюзу ў кіраўніцтве двухмесячнікам. Пляны арганізацыі МТФ некалькі разоў з-за ...тычнай сьлепаты сельгасаддзелу гарсавету ...йкалгассаюзу перарабляліся. Частка сельса...аў атрымала гэтыя пляны толькі праз месяц, ...алгасы яшчэ пазьней.

Толькі тым, што кіраўніцтва сельгасаддзелу гарсавету і райкалгассаюз з махровейшай апартуністычнай недаацэнкай, абыяк, аднесьліся да камплектаваньня стада, не забясьпечылі свой практычны ўдзел і кіраўніцтва, можна тлумачыць зрыў двухмесячніку, зрыў камплектаваньня стада і будаўніцтва скотнікаў. Нават і на сёньня ў гарсавеце няма дакладных зьвестак становішча ўкамплектаваньня стада. Між тым, матар'ялы даюць даволі яскравы малюнак ганебнага адставаньня і поўнага зрыву плянаў камплектаваньня. Прыкладна: прыгараднай гаспадарцы «Церасполь» неабходна было давесьці стада буйнай рагатай жывёлы к канцу двухмесячніку да 158 галоў замест 78. За гэты-ж час стада павялічылася толькі на 2 галавы. У каапгасах «МОПР» і імя т. Молатава з 191 галавы неабходна было давесьці стада да 300, укамплектавана толькі да 203. Такія-ж прыклады можна паказаць і навалей. Толькі больш—менш здавальняюча прайшло ўкамплектаваньне па Даўжанскаму сельсавету, па калгасах «Шлях Ільліча», „Сілач" і інш., у астатніх-жа—недапушчальна глыбокія прарывы.

«Віцебскі Пралетары» ня раз паказваў аб пагражальным становішчы камплектаваньня стада і будаўніцтва скотнікаў. Завастраў увагу на гэтых пытаньняў і гарсавету і райкалгассаюзу, але паказаньні друку зусім не ўстрывожылі кіраўнікоў гэтых установаў. Яны прапусьцілі міма сабе падаваемыя матар'ялы ў газэце. Кіраўніцтва з боку райкалгассаюзу і гарсавету фактычна ня было. Яно выяўлялася толькі ў папяровым кіраўніцтве.

Такая практыка ні ў якім разе не спрыяла пасьпяховаму выкананьню плянаў камплектаваньня стада. Яна была накіравана на зрыў гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства.

Мы ні на хвіліну не сумняваемся, што зрыўшчыкі двухмесячніку разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі панясуць адказнасьць. Тыя, дзейнасьць якіх не спрыяла выкананьню дырэктыў партыі і ўраду аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, якія сваёй дзейнасьцю ігнаравалі гэтыя дырэктывы, ня могуць быць не пакараны.

Рашуча змагаючыся з праваапартыністычнай недаацэнкай разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, што накіравана на зрыў арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, неабходна мабілізаваць масы калгасьнікаў, беднаты і серадняцтва на поўнае выкананьне плянаў камплектаваньня стада і будаўніцтва скотнікаў.

У застаўшыйся час пляны разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі павінны быць выкананы!

Буйная перамога БССР на фронце сацыялістычнай жывелагадоўлі

Заданьне па ўкамплектаваньні МТКФ выканана датэрмінова

БССР атрымала буйную перамогу на адным з важнейшых вучасткаў барацьбы за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Плян камплектаваньня малочна - таварных калгасных фэрм выканан датэрмінова. На 10 лістапада ў 1.100 МТКФ па стаўлена 78.091 дойная карова. Заданьне ўраду БССР выканана на 100,1 проц., а саюзнага ўраду—на 125,8 проц.

Гэты буйны посьпех зьяўляецца непасрэдным вынікам бальшавіцкай арганізацыі калгасных мас раду раёнаў на выкананьне адозвы ЦК і СНК аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Рагачоўскі раён выканаў плян на 197,3 проц., Лёзьнянскі—на 165 проц., Сіроцінскі—на 162%, Рэчыцкі—на 144 проц., Расонскі—на 142 проц., Жыткавіцкі—на 127 проц., Слуцкі—на 120 проц.

У гэтых раёнах была шырока разгорнута ініцыятыва саміх калгасьнікаў.

Нягледзячы на тое, што МТКФ існуюць першы год і перажываюць арганізацыйны пэрыяд, сотні з іх ужо выканалі свае абавязкі па здачы дзяржаве таварнай малочнай прадукцыі.

Ёсьць, аднак, частка раёнаў, якія яшчэ ня павярнуліся тварам да сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Такія раёны моцна адстаюць і ў справе камплектаваньня МТКФ. Кармянскі раён выканаў заданьне на 37,6 проц., Мазырскі—на 44,8 проц., Дрысенскі—на 47 проц., Уваравіцкі—на 52 проц., Чашніцкі — на 56 проц., Асьвейскі—на 58 проц., Пухавіцкі—на 59 проц., Віцебскі—на 60,7 проц.

Важнейшая задача гэтых адстаючых раёнаў — раўняючыся па перадавых, за тэрмін, які застаўся да канца 1931 г., на вярстаць упушчанае. Мабілізуючы энэргію і ініцыятыву мас калгасьнікаў, гэту задачу можна і трэба выканаць.

Усе МТКФ Беларусі павінны зараз разгарнуць сапраўды бальшавіцкую барацьбу за якасьць, за ўзьняцьцё прадукцыйнасьці буйной рагатай жывёлы, за падрыхтоўку да зімоўкі. Фарсаванае сканчэньне будаўніцтва абораў і іх ацяпленьне, мабілізацыя ўнутраных кармавых рэсурсаў і іх эканомнае выдаткаваньне—важнейшыя зьвеньні ў ланцугу мерапрыемстваў за ўзьняцьцё прадукцыйнасьці, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

(«Зьвязда»).

Не дапусьціць зрыву

У каапгасе «Новы шлях» будуецца кароўнік. Рабочыя арцелі будаўнікоў працуюць у надзвычай дрэнных умовах. Спэцвопраткай не забясьпечаны, на заявы рабочых загадчык гаспадаркі не рэагуе. На працягу чатырох месяцаў ніякіх прамтавараў рабочыя не атрымлівалі. Белкаапсаюзам на імя будаўнікоў рабочых было прыслана 300 р. для прэміяваньня, але гэтыя грошы ім не выдадзены.

Недахоп матар'ялаў зрывае будаўніцтва. Кваліфікаваным рабочым з-за неарганізаванасьці работ прыходзіцца выконваць земляныя работы.

Адміністрацыя гаспадаркі не клапаціцца своечасова забясьпечыць неабходнымі матар'ялами будаўніцтва. Кіраўніцтва рабочкому не адчуваецца.

Для забясьпячэньня выкананьня дырэктыў партыі аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі неабходна забясьпечыць жывёлу цёплым і сьветлым хлевам. Гэтыя дырэктывы ў каапгасе «Новы шлях» ігнаруюцца, жывёла знаходзіцца пад пагрозай на зіму застацца без памяшканьня.

Неабходны тэрміновыя меры.

П. Жыглінскі.

Стада не ўкамплектавана

Лужасьнянская вучфэрма мае ільно і жывёлагадоўчы ўхіл. Патрэбна было ў гэтым годзе пашырыць стада з 50 да 70 галоў, але ўкамплектаваньню пагражае зрыў. Маючыйся скотны двор цесны. У даглядзе за жывёлай існуе абязьлічка, ня ўведзе на вьдзельшчына, адсутнічае правільны дагляд за жывёлай, у выніку чаго кожны дзень скарачаецца ўдой малака. Адміністрацыя не занялася пытаньнем бракоўкі і камплектаваньня стада.

Сьвінагадоўля ў такім-жа становішча. Ніхто не клапаціцца аб пашырэньні сьвінога стада. Маючыяся 10 сьвіньней «бяспрытульныя» Умовы для пашырэньня сьвінога стаду не скарыстоўваюцца. Тэмпы будаўніцтва скотніка ні ў якім разе не забясьпечваюць сканчэньня пабудовы ў гэтым годзе. Вучфэрма не ўключылася ў двухмесячнік разьвіцьця жывёлагадоўлі.

Калі адміністрацыя тэхнікуму ня ўжыве ў бліжэйшыя дні самыя рашучыя меры для будаўніцтва скотніка, дык жывёла застанецца на зіму без памяшканьня. Абязьлічка павінна быць ліквідавана.

Мясцовы.

Стварым новыя пароды высока прадукцыйнай жывёлы

Сацыялістычная рэканструкцыя жывёлагадоўлі патрабуе стварэньня скарасьпелых і высока - прадукцыйных парод жывёлы. Гэтыя задачы будуць вырашаны шляхам масавай мэтызацыі (скрыжваньня) нізкай пародзістай жывёлы з больш каштоўнай пародзістай жывёлай.

Наркамзем СССР пастанавіў на працягу бліжэйшага 5 годзьдзя завяршыць суцэльную мэтызацыю жывёлагадоўлі. Буйная рагатая жывёла павінна быць цалкам ахоплена мэтызацыяй у 1933 годзе, а ў калгасах—у 1935 годзе, авечкі ў саўгасах—у 1931 годзе, а ў калгасах—у 1937 г., коні ў саўгасах—у 1931 г., а ў калгасах—у 1937 г.

Вялікае значэньне для мэтызацыі мае штучнае абсемяненьне. Колькасьць штучнага абсемяненьня мае так ужо ў 1932 годзе па буйнай рагатай жывёле дасягае 2-х мільёнаў галоў, па сьвіньнях—200000 галоў, па конях 560 тыс. галоў.

Абязьлічка ў пашане

У калгасе «Чырвоная слабодка», Міхалёўскага сельсавету, не ліквідавана абязьлічка ў даглядзе за жывёлай. Жывёла «гуляе» па пасеву, а брыгадзір Дрындрожык, замест таго, каб прыняць меры, адказвае: «Чорт яе ня возьме».

Праўленьню калгасу неабходна зьвярнуць на гэта ўвагу. Трэба ліквідаваць абязьлічку ў калгасе.

Шамшура.

Ліквідаваць недахопы

З-за таго, што ў калгасе імя Карла Маркса, Сяляцкага сельсавету, яшчэ існуе абязьлічка, жывёла знаходзіцца без усялякага догляду. Каровы і сьвіньні ходзяць па гародах, азіміне і наносяць вялікую шкоду пасеву. Калгасьнік Матчаеня Сямён пускае сваіх сьвіньней на калгасныя палі і, нягледзячы на тое, што яму неаднаразова рабіліся заўвагі, ён на іх не рэагуе.

Калгас імя Карла Маркса павінен у даглядзе за жывёлай ліквідаваць абязьлічку. Яина з-пад Віцьбы.

Пастановы партыі аб жывёлагадоўлі ігнаруюцца

Рабочымі гаспадаркі «Тулава» ня раз унасіліся прапановы аб укараненьні прагрэсіўнай вьдзельшчыны і наладжваньні вучоту працы, але з-за апартуністычных адносін загадчыка гаспадаркі Арцішэўскага гэтае не праводзіцца. Абязьлічка ў даглядзе за жывёлай не ліквідавана. Праца на скотных дварох пастаўлена дрэнна. Жывёла знаходзіцца ў самым брудным становішчы. Будаўніцтва скотнікаў ідзе марудным тэмпам.

Адміністрацыя гаспадаркі на ліквідацыю гэтых недахопаў не звяртае належнай увагі і ігнаруе дырэктывы партыі аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Апартуністых, якія ігнаруюць важнейшыя партыйныя і ўрадавыя дырэктывы, трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Карклёў, Кавлоў.

Дзесяць ільнозаводаў своечасова увядзем у строй

Бальшавіцкімі тэмпамі рэалізаваць пастановы ЦК КП(б)Б

...усьціць 10 ільнозаводаў у ...ладзе — баявая задача, па...леная ЦК КП(б)Б.

...з гэтых 10 віцебскім будаўнічым ...істкам павінны быць пушчаны ва ...ноўлены тэрмін. Усе заказы для ...сьпечаньня пуску 5 ільнозаво...разьмешчаны на заводах «Кам...рн», «Чырвоны мэталіст» і ін...мэнтальна мэблёвай фабрыцы. ...очыя гэтых заводаў па-бальша...у распачалі прасоўваньне гэтых ...заў. К 22 лістапада, згодна па...ановы сходаў рабочых, заказы па...ы быць выкананы.

...агледзячы на шэраг канкрэтных ...ланоў брыгады ЦК КП(б)Б і гар...у партыі, апарат будаў...га вучастку не пераклю...ся на бальшавіцкія тэмпы рабо...па ліквідацыі прарываў у будаў...ве ільнозаводаў. Загадчык ву...тку Розенблюм, намесьнік яго ...раўсні, тэхнік-мэханік Пятроў і ...рэйшы бухгальтар Вігдаровіч ...ацаюцца тэмпамі выконваюць ...ланову партыі. Манцёры-брыга...ы замест мантажнай работы на ...одах займаюцца іншымі справамі. ...ацыялістычнае спаборніцтва і ...рніцтва сярод работнікаў вучастку ...а пабудове ільнозаводаў не раз...нута. Прэміяльныя фонды для ...рнікаў разьмяркоўваюцца не на ...ставе ўлку паказчыкаў працы.

...асобныя працаўнікі віцебскага бу...нічага вучастку (Вігдаровіч, Пят...ў) замест бальшавіцкай упартасьці ...рабоце займаюцца у гэты час ...мовамі аб павышэньні пэнсіі, тэх...мэханік вучастку Пятроў замест ...кананьня пастаноў ЦК КП(б)Б ад...вае: «Нам не разарвацца, брыга...перашкаджаюць нам работаць» ...ш. Розенблюм і Мураўсні за...ст прыняцьця адпаведных мер ...трымліваюць Пятрова і Вігда...віча.

...адміністрацыя будвучастку не са...ць за тым, як выконваюцца прад...ёмствакі Віцебску заказы ільно...водам.

...Парт'ячэйка і мясцком павінны ...цягнуць да адказнасьці ўсіх тых, ...ь тармозіць выкананьне пастано...ЦК КП(б)Б аб хутчэйшай пабу...е ільнозаводаў.

...рэба мабілізаваць усю савецкую ...мадзкасьць на выкананьне пастаны ЦК КП(б)Б і гаркому партыі ...пазьней вызначаных тэрмінаў.

Брыгада: ЦК КП(б)Б, «Калгасьнік Беларусі», «Віцебскі Пралетары», Белільноканапляводбуду А. Ярмонік, А. Мухін, С. Рубікоўс..., Грабіна, Ж...чкой.

Актыўна змагацца за своечасовы пуск ільнозаводаў

Адкрыты ліст да газэт «Палеская праўда» (Гомель), «Ленінскі прызыв» (Ворша), «Чырвоная Полаччына» (Полацак), «Калгасная праўда» (Гарадок), «Прымежны калгасьнік» (Вушачы) і „За сацыялістычны транспарт" (чыгунка—Віцебск).

У выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб абавязковым пуску ў лістападзе месяцы 1931 г. 10-ці ільнозаводаў, мы, сумесна з „Калгасьнікам Беларусі", разгарнулі апэрацыйна-масавую работу на прадпрыемствах Віцебску, якія павінны даць для заводаў патрэбнае абсталяваньне.

Мы зварачваемся да «Палескай праўды»—арганізаваць работу на прадпрыемствах, у прыватнасьці на Гомсельмашы, за своечасовую дачу абсталяваньня для ільнозаводаў.

Мы зварачваемся да газэт тых раёнаў, дзе праходзіць будаўніцтва, каб гэтыя газэты ўстанавілі свой нагляд, разгарнулі масавую работу за ажыцьцяўленьне ўдарных плянаў будоўлі.

Газэта «За сацыялістычны транспарт» павінна ўзяць пад асобны нагляд справу пагрузкі, адпраўленьня і дастаўкі абсталяваньня для ільнозаводаў.

Пастанова ЦК патрабуе ўдарных тэмпаў ад партыйных арганізацый і гэтым самым да партыйна-савецкіх газэт. Наша апэрацыйна-масавая работа павінна дапамагчы рэалізацыі гэтай пастановы.

З камуністычным прывітаньнем
рэдакцыя газэты
«Віцебскі Пралетары»

НЕ ЗАТРЫМЛІВАЦЬ ЗАКАЗАЎ ІЛЬНОЗАВОДАМ

З 14-га лістапада ўсе цэхі заводу „Камінтэрн" па баявому пераключыліся на выраб неабходных частак для ільнозаводаў. Два валавых станка аслабанены ад іншай работы і выконваюць толькі заказ № 1317 (для ільнозаводаў).

Трансмісійныя валы і буйныя валы на 70 мм. выконваюцца бесьперабойна. Для валоў на 60 і 50 м.м. няма патрэбнага асартымэнту матар'ялу. Калі запыталі ў інжынэра ільноканапляводсаюзу, ці можна пры дапамозе муфты злучаць вал з двух частак, ён адказу ня даў і гэта тармозіць работу.

Загадчык цэхам Мэерзон свой выхадны дзень 13-га лістапада аддаў для падбору дэталяў з частак, якія маюцца на складзе. Згатоўлена 24 камплекты карпусоў для падшыпнікаў на 70 м/м. якія патрабуюць ...ладк... Падвескі, згодна заказу 60 штук, завод пачаў вырабляць. Ужо гатова 25 штук. Падшыпнікаў дыямэтрам 60 м/м. згатоўлена 12 штук, 50 м/м.—24. 18-га лістапада пачнуць тачыць падшыпнікі на 70 м/м. Два шківы па заказу ўжо адліты.

Усяго заказана 4 шт. дымагарных труб. Ільноканапляводсаюз павінен прадставіць кацельнае жалеза, што выканана ім для аднэй трубы, якая гатова. Выраб астатніх трох труб залежыць ад своечасовага прадстаўленьня кацельнага жалеза. Усе меры прыняты. Узорныя тэмпы ўдарнай работы паказваюць сьлясарны і такарны цэх і асабліва загадчык гэтых цэхаў т. Мэерзон. Па прыкладу т. Мэерзона рабочыя ўсіх цэхаў павінны працаваць над выкананьнем ударных заказаў ільнозаводам.

М. Ве...сон.

Біць па апартуністычных настроях чарговасьці

Зяб

ЗАРАЗ-ЖА ВЫКАНАЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ І ЎРАДУ АБ ПЕРАКІДЦЫ ЦЯГАВАЙ СІЛЫ НА ЗЯБЛІВА

Даць бой

апартуністычным адносінам да зябі

Дырэктывы партыі і ўраду аб узьняцьці яравога кліну пад зяб не знайшлі свайго адпаведнага ажыцьцяўленьня па калгасах і аднаасобным сэктару нашага раёну. На 15-га лістапада калгасамі ўзьнята пад зяб толькі 8642 га з патрэбных 14430 га, ці 59 проц. Аднаасобнікамі ўзьнята 2290 замест патрэбных па пляну 5270 га, ці 43 проц.

Асабліва ганебна адстаюць В.-Лётчанскі, Міхалёўскі і Бабініцкі сельсаветы. Шумнянскі сельсавет у значнай ступені падцягнуўся і падыходзіць да выканань ня пляну зяблева.

Адставаньне ў астатніх сельсаветах тлумачыцца выключна недаацэнкай зяблівага ворыва, яго гаспадарча-палітычнага значэньня з боку раённых і нізавых кіруючых арганізацый.

Разважаньні аб тым, што зараз ужо ніякай карысьці ад зяблівага ворыва ня будзе, зьяўляцца аднэй з галоўнейшых прычын маруднага выкананьня пляну.

Сельсаветы не даўлічылі таго, што барацьба за зяб ёсьць барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, барацьба за высокі ўраджай. У той час, калі ў В.-Лётчанскім сельсавеце ганебныя паказальнікі ў зяблівым ворыве, сельсавет нічога ...зрабіў, каб забясьпечыць перакідку цягавай сілы на гэты вучастак работы.

Неабходна пакласьці канец апартуністычным адносінам да зяблева, не дапускаць ніякіх адступленьняў ад пляну. Рашуча біць па дэзарганізуючых настроях. Да наступленьня замарозкаў у нас ёсьць усе магчымасьці поўнасьцю выканаць пляны зяблівага ворыва.

За 5-дзёнку паднялі 5 га

За апошнюю пяцідзёнку амаль ніякага зруху ў зяблівым ворыве па калгасах Міхалёўскага сельсавету няма. Замест 840 га ўзьнята толькі 430. Калгасы ўзьнялі толькі 5 га. З-за таго, што на вучастках зяблівых успашак няправільна расстаўлены сілы, брыгадам не дадзены сутачныя заданьні. 80 процантаў цягавай сілы не перакінута на зяблівае ворыва, маюцца надзвычайна ганебныя паказальнікі ў выкананьні пляну.

Тэмпы павінны быць узьняты. Не чакаючы замарозкаў, калгасы Міхалёўскага сельсавету павінны тэрмінова пераключыць цягавую сілу на зяблівае ворыва, каб папярэдзіць зрыў.

Пятроў.

Цягавую сілу не перакінулі

Калгасы Бабініцкага сельсавету не пераключылі цягавую сілу на зяблівае ворыва, у выніку чаго з 1160 га паднята толькі 700. Толькі 60 проц. усіх коняй кінуты на зяб, а між тым, згодна дырэктывы партыі і ўраду, трэба 80. Сельсавет нічога не зрабіў, каб забясьпечыць своечасовае выкананьне пляну зяблева. У той час, як некаторыя калгасы плянаў зяблівага далёка не выканалі, маюцца выпадкі, калі яны спынілі зяблеўць.

Калгасы не паказваюць прыкладаў ударнага змаганьня на зяблева. За час з 10 да 15 лістапада калгасамі паднята толькі 80 га. Такія тэмпы ні ў якім разе не забясьпечваюць сканчэньня зяблівага ворыва да замарозкаў. Аднаасобны сэктар свой плян—260 га выканаў поўнасьцю. Калгасы павінны рашуча ўзьняць тэмпы зяблівага ворыва сэктара.

Б.

„Раней здадім бульбу, а потым возьмемся зяблеўць"

У В.-Лётчанскім сельсавеце ня здолелі ўвязаць нарыхтоўкі з зяблевым ворывам. Апартуністы размаўляюць: «раней здамо бульбу, а потым возьмемся зяблеўць». Плян зяблева тут пад пагрозай зрыву. Замест 600 га ўзьнята на 15-га лістапада 473, а аднаасобнікі ўсяго 321 га. Калгасы павінны былі перакінуць цягавую сілу на зяб, але коняй недастаткова скарыстоўваюць. З 275 коняй, маючыхся ў калгасах, перакінута на зяб толькі 62, а ў аднаасобнікаў з 167—39.

Калгас «Бярозка», які асабліва адстае, зусім незначную колькасьць коняй перакінуў на зяблева ворыва. Парт'ячэйка В. Лётчанскага сельсавету нічога не зрабіла, каб вышэй узьняць тэмпы зяблева. Гэтае мерапрыемства парт'ячэйка нават не абгаварвала. Маюцца разважаньні, што «ня сьлед змагацца за зяб, бо ўжо позна і карысьці ніякай няма». Ячэйка ня толькі не ўдарыла па гэтых шкодных настроях, але асобныя члены партыі нават падтрымліваюць іх.

ГК партыі павінен сказаць сваё слова наконт парт'ячэйкі В.-Лётчанскага сельсавету, якая не забясьпечыла свайго апэрацыйнага кіраўніцтва на такім адказным вучастку, як зяблева ворыва.

Неабходна максымальна скарыстаць кожны застаўшыйся дзень для стопроцантнага выкананьня пляну.

Х. В.

Шумнянскі сельсавет скончыць ворыва зябі

У Шумнянскім сельсавеце ў бліжэйшыя дні зяблева ворыва будзе скончана. Па калгасах засталося менш 200 га. Сельсавет своечасова даў дырэктыву калгасам аб перакідцы 80 процантаў цягавай сілы на зяб. 210 коняй пастаўлены на зяблева ворыва. Уведзена вьдзельшчына.

Адставаньне наглядаецца ў саўгасе «Сасноўка» і камуне „Іскра ленінская".

Калгасы, якія пасьпяхова сканчваюць зяблева, павінны дапамагчы адстаючым.

Шумнянскі.

На Савецкаму Саюзу

Замежны пралетарыят ганарыцца дасягненьнямі СССР

КІЕУ. Зварочваючыся на бацькаўшчыну пасьля прабываньня ў СССР, група нямецкіх рабочых адправіла т. Молатаву тэлеграму, у якой гаворыцца: «Мы бачылі сапраўдны энтузіязм шырокіх працоўных мас і ўсе бачанае намі перапоўніла нашы сэрцы пачуцьцём вялічэзнага захапленьня і гонару за перадавы атрад сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі. Мы перададзім нашым рабочым радасную вестку аб тым, як пасьпяхова ідзе ажыцьцяўленьне ліганцкай пяцігодкі, якую СССР, бязумоўна, выканае за чатыры гады. Мы даём клятву, што ў выпадку нападу на СССР, кожны з нас паўстане на абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны працоўных».

Лепшыя калгасьнікі ідуць у шэрагі партыі

(На раённых партканфэрэнцыях Паўночнага краю)

Нябывалай палітычнай актыўнасьцю суправаджаюцца адбываючыяся ў краі раённыя партыйныя канфэрэнцыі. Калгасьнікі рапартуюць канфэрэнцыям аб сваіх перамогах. Партканфэрэнцыю Падасінаўскага раёну прывіталі 12 дэлегацый калгасьнікаў, якія заяўлялі: «ніхто ніякімі сродкамі ня прымусіць нас вярнуцца да аднаасобнай гаспадаркі»: Падасінаўскі раён выканаў усе асноўныя гаспадарча палітычныя кампаніі. Раён калектывізаваны на 68 проц. За апошні час партарганізацыя вырасла ў два разы за лік перадавых калгасьнікаў.

Тоцемская партарганізацыя прышла к канфэрэнцыі з буйнай перамогай, павялічыўшы свае шэрагі на працягу году ў 12 разоў. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі Тоцемскага раёну з 7 проц. паднялася да 62-х.

Раёны сярэдняй Волгі выканалі плян зяблева

Прэміі раёнам, саўгасам, калгасам

Сярэдняволскі крайком і крайвыканком прэміявалі за 100 процантнае выкананьне пляну зяблева 6 раёнаў краю: Самарскі, Шарлыкскі, Андрэеўскі, Карсунскі, Чардаеўскі і ...ньгуп...ўскі. Гэтыя раёны прым...ваны сумамі ад 5-ці да 15.000 руб. 15 лепшым калгасам выданы прэміі ад 1 тысячы да 5 тысяч руб. Вылучаны 23 пэрсанальных прэміі. Для прэміяваньня лепшых ударн... ...адскаюцца грамтав... ...ы на 100 ...с. р...

Мабілізаваць усю масу чыгуначнікаў на бальшавіцкае выкананьне пастаноў пленуму ЦК—

БАЯВАЯ ЗАДАЧА, ЯКУЮ ЧЫГУНАЧНЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ У ЧАСЕ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ ПАРТОР

Кожны камуніст, кожная ячэйка павінны быць у авангардзе

барацьбы за пасьпяховае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб асеньня-зімніх перавозках

СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ НІЗАВЫХ ПАРТОРГАНАЎ НА ЧЫГУНЦЫ ПАВІННА УЗЬНЯЦЬ ЭНТУЗЫЯЗМ МАС НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ 6-ці УМОЎ тав СТАЛІНА, ЗАГАДУ т. АНДРЭЕВА, ПАСТАНОЎ ЦК ПАРТЫІ. ЯЧЭЙКА, НЯ ЗДОЛЕЎШАЯ УЗЬНЯЦЬ УСЮ СУМУ ГЭТЫХ ПЫТАНЬНЯЎ, НЯ СПРАВІЦЦА З УСКЛАДЗЕНЫМІ НА ЯЕ ЗАДАЧАМІ

ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ ПАРТРАБОТЫ НА ТРАНСПАРЦЕ

Кастрычнікаўскі пленум ЦК УсеКП(б) падкрэсьліў выключнае значэньне партыйнай работы на чыгуначным транспарце. На ўсе партарганізацыі і асабліва на партарганізацыю транспарту пленумам ЦК ускладзена вялізная адказнасьць за карэннае паляпшэньне работы чыгуначных дарог у самы кароткі час.

У «Правде» была ўжо зьмешчана рэзалюцыя партактыву чыгуначнікаў Маскоўскага вузлу па дакладу т. Андрэева. Бальшавікі Маскоўскага вузлу ўзялі на сябе абавязак забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак і ні ў якім разе не дапусьціць мінулагодніх перабояў у рабоце Маскоўскага вузлу. Актыў паказаў на буйную ролю ўсёй маскоўскай арганізацыі ў ажыцьцяўленьні гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы.

Па прыкладу камуністых Масквы павінны безадкладна мабілізавацца на баявое ажыцьцяўленьне рашэньняў партыі па транспарту ўсе мясцовыя чыгуначныя партарганізацыі.

Баявая задача транспарту застаіць зараз у тым, каб бесьперабойна і чотка перасоўваць па ўсёй тэрыторыі краіны вялізныя, усё павялічваючыяся масы будматар'ялаў, сыравіны, хлебных грузаў, прамтавараў і г. д. Між тым, «чыгуначны транспарт, ня гледзячы на некаторае падвышэньне сваёй работы ў параўнаньні з мінулым годам, усё яшчэ застаецца вузкім месцам і аднэй з сур'ёзных перашкод у справе пасьпяховага выкананьня народна-гаспадарчых плянаў» (кастрычнікаўскі пленум). Што дзённая нагрузка ў кастрычніку складала ў сярэднім 54.000 вагонаў у суткі замест мінімальна неабходных 66.000.

Адставаньне чыгуначнага транспарту ў асноўным тлумачыцца тым, што дагэтуль яшчэ не ліквідаваны абязьлічка і безадказнасьць у розных зьвеньнях транспарту: на паравозе, у дэпо, на станцыях, у рамонтных майстэрнях. Рашучай бальшавіцкай барацьбы са зрывам спарамайне вялося. Процант хворых паравозаў перавышае норму. Невыстарчальна скарыстоўваюцца вялізныя ўнутраныя рэсурсы транспарту. У зарплаце да сучаснага моманту цалкам яшчэ не ліквідавана ўраўнілаўка. Дагэтуль гаспадарчыя органы і прафсаюзы на транспарце не дабіліся рашучага зруху ў упарадкаваньні арганізацыі працы, зарплаты і паляпшэньні забесьпячэньня. Як паказаў пленум ЦК, аднэй з асноўных прычын усіх недахопаў на транспарце зьяўляецца «коснасьць і бюракратызм транспартнага апарату і няўменьне кіраўнікоў чыгуначнікаў—камуністых змагацца з гэтымі коснасьцю і бюракратызмам».

Пленум ЦК цалкам ухваліў мерапрыёмствы па аздараўленьні транспарту, што праводзяцца новым кіраўніцтвам НКШЗ. Настойлівае правядзеньне гэтых мерапрыемстваў у жыцьцё павінна стаць праграмай штодзённай работы кожнай чыгуначнай ячэйкі, кожнага камуніста транспарту.

Нясумненна, што задача ўзьняцьця чыгуначнага транспарту на той узровень, якога патрабуюць інтарэсы народнай гаспадаркі, у вялізнай меры ўпіраецца ў палепшаньне работы партарганізацыі. Між тым, становішча работы ў большасьці партарганізацый не адпавядае пастаўленым задачам. У большасьці партарганізацый транспарту рашэньне ЦК партыі аб перабудове партыйна-масавай работы не праводзіцца з патрэбнай энэргіяй (масавая работа, ударніцтва, сацспаборніцтва ў цэху, брыгадзе слаба разгорнуты). Партыйныя сілы не расстаўлены адпаведна значэньню таго ці іншага вытворчага участку, часта ня ведаюць як наладзіць работу, а дастатковай дапамогі ім не аказваецца.

Асноўнае ў партыйна-масавай рабоце на транспарце зараз заключаецца ў тым, каб мабілізаваць усю масу камуністых і беспартыйных чыгуначнікаў на ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна. Трэба канкрэтна, у практыцы масавай работы па ставіць пытаньні арганізацыі працы і вытворчасьці, пытаньні барацьбы з „дявацкай" ураўнілаўкай і абязьлічкай, як на паравозе, так і ў дэпо і на шляхох. Трэба дабіцца аўладаньня масамі тэхнікай, зьверху да нізу ўкараніць гаспадарчы разрахунак.

Значная частка партыйных ячэек на транспарце дагэтуль абмяжоўвалася фармальнай праработкай 6-ці ўмоў т. Сталіна.

Па разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва транспартмікі значна адстаюць ад рабочых асноўных галін прамысловасьці. Зусім недастаткова разгорнута ўдарніцтва сярод камуністых. Вялікае месца на транспарце маюць яшчэ парушэньні працдысцыпліны.

Пільна ахоўваць інтарэсы пралетарскай дзяржавы ад пранікненьня буржуазных і кулацкіх уплываў у паасобных зьвеньнях транспарту—справа пралетарскага гонару кожнага чыгуначніка, асабліва члена партыі. Коснасьць і бюракратызм, што зьвілі моцнае гняздо ў радзе звеньняў транспартнага апарату, няўменьне чыгуначнікаў—камуністаў у радзе выпадкаў змагацца з буржуазнымі тэндэнцыямі, з очкаўцірацельствам і інш. зьяўляецца значным тормазам у падняцьці работы транспарту.

Неабходна рашуча ўзмацніць барацьбу на два фронты з усімі праявамі апартунізму на транспарце, у першую чаргу з правым апартунізмам. За апошні год адбылася вялікае папаўненьне радоў транспартнага пралетарыяту новымі рабочымі. У чыгуначных ячэйках вялікі процант складаюць маладыя члены партыі і кандыдаты. Нельга дабіцца шпаркага ўзьняцьця работы транспарту без разгортваньня работы сярод новых рабочых. Задача марксыцка-ленінскага выхаваньня на транспарце, асабліва сярод новых кадраў, высоўваецца з ўсёй гастратой.

За апошні час разьвіўся і акрэп на транспарце інстытут партарганізатараў, хоць яго асноўная задача—кіраўніцтва і дапамога нізавому партыйнаму зьвяну выконваецца яшчэ недастаткова. Асабліва значэньне інстытуту партарганізатараў зьвязана, як адзначыў пленум ЦК, ня толькі з умацаваньнем і ўздымам партыйнай работы.

Праз гэты інстытут у значнай меры ідзе падрыхтоўка партыйных работнікаў для работы ў гасапараце транспарту. Пленум прызнаў неабходным перавод частак транспартных парторгаў на гасработу. Важнейшай задачай, як падкрэсьліў пленум зьяўляецца ўмацаваньне камуністычнымі кадрамі зьверху да нізу ўсіх зьвеньняў апарату кіраўніцтва, асабліва службы руху, шырокае вылучэньне моцных, актыўных камуністых транспартнікаў на адказную гаспадарчую работу. Узорная работа транспарту зьяўлячецца справай гонару для кожнага бальшавіка.

Пленум ЦК прама паказаў што «ЦК будзе лічыць мясцовыя партарганізацыі адказным за прарывы ў рабоце транспарту на тым ці іншым вучастку»

Камуністы-чыгуначнікі знаходзяцца на адным з адказнейшых франтоў сацбудаўніцтва, барацьбы за завяршэньне фундаманту сацыялістычнай эканомікі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. Партыя будзе ацэньваць палітычнае становішча і работу кожнай ячэйкі, партгрупы, работу кожнага камуністага па ступені выкананьня дарогай, вузлом, станцыяй, дэпо вытворчых паказальнікаў.

На падставе цьвёрдага правядзеньня дырэктыў партыі, дырэктыў апошняга пленуму ЦК, бальшавікі-транспартнікі, абапіраючыся на ўсю армію чыгуначнага пралетарыяту, нясумненна забясьпечаць ператварэньне транспарту з «вузкага месца» у магутны фактар нашага далейшага руху ўперад, далейшых перамог сацыялізму.

(З перадавой «Правды»).

Вытруціць корані апартунізму

Узьняць на вышэйшую ступень работу транспарту, поўнасьцю забясьпечыць пасьпяховасьць асеньня-зімовых перавозак—баявая, неадкладная задача чыгуначных арганізацый.

Неадчарговыя пастановы вышэйшых партыйных арганізацый і загад тав. Андрэева намецілі шлях для таго, каб вывесьці чыгуначны транспарт з паласы прарываў, каб узьняць яго работу на належную вышыню.

Бясспрэчна, што выкананьне транфінпляну галоўным чынам залежыць ад умелага кіраўніцтва кіруючых арганізацый транспарту.

Як забясьпечыла партыйная ячэйка апарату кіраўніцтва 6-га эксплёатацыйнага раёну выкананьне пастаўленых перад транспартам задач бачна з наступнага:

Загад тав. Андрэева, які мабілізаваў усю пралетарскую грамадзкасьць транспарту на выкананьне транфінпляну, прайшоў міма парт'ячэйкі апарату раёну. Яна абмежавалася толькі тым, што загад тав. Андрэева быў заслуханы на партыйным сходзе. Ніякіх канкрэтных мер, выходзячых з загаду бальшавіка наркома, ячэйка не выпрацоўвала.

Пастанова пленуму ЦК УсеКП(б) аб транспарце была разабрана на сходзе ячэйкі, дзе не прысутнічаў амаль ніводзін беспартыйны. Сход пастанавіў: «даручыць бюро ячэйкі выпрацаваць канкрэтныя меры для правядзеньня ў жыцьцё рашэньняў пленуму ЦК. Што зроблена ячэйкай па гэтай пастанове невядома, але вядома тое, што ніводнае мерапрыемства не выпрацавана і сёньня.

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б па дакладу тав. Брадзянка аб віцебскім чыгуначным вузле ня толькі не распрацоўвалася, але нават ня была разабрана на сходах.

Наогул трэба адзначыць, што парт'ячэйка апарату раёну вытворчымі пытаньнямі не займалася.

Партыйная сіла расстаноўлена недапушчальна дрэнна. Большая колькасьць партыйцаў сканцэнтравана ў паасобных аддзелах, а ў галоўных аддзелах партыйцы амаль адсутнічаюць. Так, у аддзеле эксплёатацыі маецца ўсяго адзін камуніст, цягі—2, у МХ—2, а ў пуці і бухгальтэрыі, дзе працуе больш 100 чал., няма ніводнага партыйца. Між тым ячэйка налічвае 45 партыйцаў, якіх магчыма належным чынам расставіць па аддзелах.

Ударніцтва і спаборніцтва паміж паасобнымі супрацоўнікамі і аддзеламі адсутнічае. На зьдзельшчыну работнікі апарату не перайшлі. Адсутнічае вучот работы інжынэрна-тахнічных сіл. Кіраўнікамэрцыйнага аддзелу **Эрдман** амаль ніколі ня бывае на вытворчасьці. У рабоце аддзелаў апарату раёну панае поўная абязьлічка.

У апараце ёсьць шмат рабочых-вылучэнцаў, але ніхто ім у рабоце не дапамагае.

У лік 75 партыйцаў, накіраваных на ўзмацненьне транспарту, у МХ быў накіраваны рабочы вылучэнец тав. Вайханскі, але доўга яму працаваць ня прыйшлося, бо ён быў адтуль выжыты кіраўніком МХ **Эрдманам**.

Кіраўніцтва раённага апарату ўвесь час адмаўляецца накіроўваць камуністых для работы ў тэхнічныя аддзелы з тэй прычыны, што яны нібыта незнаёмы з тэхнікай, а вось для таго, каб яны аўладалі тэхнікай, ніхто нічога ня робіць. Неаднаразовыя пастановы бюро ячэйкі аб арганізацыі тэхнічных гурткоў засталіся на паперы.

Па беларусізацыі нічога не праводзіцца. Гурткі па вывучэньні беларускай мовы не арганізаваны. Апарат да гэтага часу яшчэ не беларусізаваны.

Як адносяцца тут да беларусізацыі, відаць з разважаньняў аднаго з кіраўнікоў раённага апарату Літвінава, які кажа: «трэба хутка перайсьці ў другі аддзел, можа там ня будуць прымушаць вучыць беларускую мову». Вялікадзяржаўны шавіністы рэвізор Дарафееў, нягледзячы на пастанову бюро ячэйкі аб зьняцьці яго з работы, да гэтага часу яшчэ працуе.

З партвучобай таксама справа абстаіць дрэнна. Заняткі рэгулярна наведвае 10—15 проц. партыйцаў. Да прагульшчыкаў партвучобы ячэйка ніякіх мер ня прымае.

Пытаньнем росту партыі за лік лепшых ударнікаў ячэйка не займаецца.

Крытыка і самакрытыка адсутнічае. Па ўсяму віцебскаму вузлу налічваецца ня больш 10 рабкораў. На допісы, зьмяшчаемыя ў друку, не рэагуюць.

Камсамольская ячэйка таксама не працуе, ніякай дапамогі ёй з боку парт'ячэйкі няма. Калі камсамольская ячэйка пажадала паставіць даклад на сходзе аб задачах камсамоліі на транспарце, дык памнач. раёну Самайлюк адказала: «гэта ня справа камсамольскай ячэйкі».

Культурна-масавай работы няма. Грамадзкія арганізацыі бязьдзейнічаюць. За апошнія 3 месяцы нават і месяцовак не існаваў.

Надыходзяць перавыбары партыйнай арганізацыі. Як жа бюро ячэйкі рыхтуецца да гэтай палітычнай кампаніі?

Трэба адзначыць, што парт ячэйка праводзіць падрыхтоўчую работу да перавыбараў, не ўвяваючы яе з палітычна-гаспадарчымі задачамі, якія стаяць перад транспартам. Шырокая маса не мабілізаваная. Беспартыйныя рабочыя нават і ня ведаюць аб праводзімай перавыбарчай кампаніі. Ліст ЦК КП(б)Б аб задачах у часе перавыбараў у ячэйцы і сярод беспартыйных не абгаварваўся. Падрыхтоўчая работа да перавыбараў выражаецца выключна ў складаньні брыгады з 15 ці чалавек.

Камэнтарыі непатрэбны. Факты выразна гавораць аб апартунізьме, які ўвесь час існуе ў адным з галоўных зьвеньняў чыгуначнага транспарту—парт'ячэйкі раённага кіраўніцтва. У новы склад бюро трэба абраць лепшых бальшавікоў, якія поўнасьцю забясьпечаць выкананьне гаспадарча-палітычных задач, стаячых перад транспартам.

Дзядзі Зарубежны, Міхась Чыгуначны.

Займаюцца фіксацыяй фактаў

Значна пагоршылася за апошні час работа ячэйкі вагоннай майстэрні. Дасягненьні, якія мела ячэйка ў мінулым, не замацаваны. Процант хворых вагонаў увесь час павялічваецца: жнівень—паўтары процанта, верасень—2, кастрычнік—3, а на сёньняшні дзень ёсьць 5 проц хворых вагонаў. Ячэйка зусім слаба мабілізавала рабочыя масы на ліквідацыю прарываў.

Маецца шэраг выпадкаў фіксацыі недахопаў, а мер ніякіх ня прымаецца. Напрыклад, у жніўні месяцы пры аглядзе становішча партмасавай работы і ходу праверкі выкананьня 6 ці паказаньняў тав. Сталіна канстатавана наяўнасьць абязьлічкі варштатаў. Было прапанавана гэта зьнішчыць, але брыгада выявіла, што абязьлічка тут яшчэ жыве. Працдысцыпліна кульгае. За кастрычнік было 18 прагулаў, галоўным чынам сярод часовых рабочых, сярод якіх ніякай працы не праводзіцца.

За апошнія шэсьць месяцаў ячэйка вырасла толькі на 6 чал. Наведваньне саўпартшколы дрэннае, а першапачатковая школа зусім не працуе. Няма вучоту ўдарніцтва і сацспаборніцтва. Бюро ячэйкі дрэнна кіруе цэхкомам і грамадзкімі арганізацыямі. Насьценгазэта выпускаецца вельмі рэдка. Партдысцыпліна кульгае. Маюцца выпадкі, калі асобныя члены партыі не плацяць членскія ўзносы па 4—5 месяцаў—сярод іх маюцца нават члены бюро ячэйкі (Брыдок, Карэлін, Дзянісаў, Лапа, Сівохін).

Ячэйка павінна зараз-жа перабудаваць партработу тварам да вытворчасьці, перанесьці цэнтр цяжару работы ў цэх, брыгаду, мабілізуючы ўсю рабочую масу на зьнішчэньне маючыхся недахопаў.

Ячэйка павінна па-бальшавіцку ўзяцца за выкананьне пастаноў ЦК, загаду тав. Андрэева і 6-ці паказаньняў тав. Сталіна.

Барыкадаў.

Зьнішчыць недахопы ў рабоце ячэйкі

Ячэйка таварнага двара за апошні час мае некаторыя палепшаньні ў сваёй рабоце. Яна канкрэтна падышла да кіраўніцтва вытворчасьцю. У кожнай групе грузчыкаў арганізаваны трыкутнікі і праведзена расстаноўка партыйных сіл, што дало большую магчымасьць мабілізацыі мас і рабочых на выкананьне вымрнікаў. У выніку прапрацоўкі загаду тав. Андрэева, пастаноў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б павялічыўся ахоп сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам рабочых да 95 проц. Арганізавана 11 скраўных брыгады, палепшана працдысцыпліна і адносіны да работы. За кастрычнік прынята ў партыю 47 асоб.

Але побач з гэтым, ячэйка мае яшчэ шэраг недахопаў. Зусім не здавальняючае становішча з працдысцыплінай сярод часовых рабочых. Першая дэкада лістапада месяца дае 19 прагулаў з агульнага ліку 150 рабочых. Белмова членамі партыі не ўжываецца. Створаны гурток па белмове дрэнна наведваецца. Маецца вялікая колькасьць няпісьменных, існуючы гурток вельмі слаба працуе. Таксама недастатковы ахоп партвучобай партыйцаў і беспартыйных. Вельмі слаба ячэйка абслугоўвае рабочых грузчыкаў раз'езда Чэпіна, дзе маецца 36 рабочых, з іх 11 кандытаў партыі, якія нядаўна ўступілі ў партыю.

Ячэйка павінна замацаваць маючыяся дасягненьні, зьнішчыць паказаныя недахопы і па бальшавіцку выканаць пастановы ЦК і загад тав. Андрэева.

Брыгада.

ВІЦЕБСКІ ВУЗЕЛ НЕ ВЫШАЎ З ПАЛАСЫ ПРАРЫ

Нячоткасьць работы дыспэтчараў, дзяжурных па дэпо і па станцыі, нядбайныя адносіны стоў агляду, змазчыкаў і паравозных брыгад—прычыны несваечасовага сьледваньня цягнікоў, прычыны, пагражаючыя зрывам выкананьне загаду т АНДРЭЯВА аб дадатковым гадзіне работы паравоза і вагона

Таварышы чыгуначнікі! Ганіце ўніз крывую проц. хворых паравозьнішчайце абязьлічку пастаноўкі і прыёмкі паравозаў

„ЦК КП(б)Б патрабуе ад гаспадарчага, партыйнага і прафсаюзнага кіраўніцтва раёну дабіцца ў бліжэйшы час рашучага пералому ў рабоце. .. У цэнтр увагі паставіць пытаньне ўзьняцьця і аздараўленьня працдысцыпліны, асабліва паравозных брыгад, зьнішчэньня прагулаў, нядбайных адносін да сваіх абавязкаў і т. д., увяраўшы барацьбу за працдысцыпліну з поўным выкананьнем эксплёатацыйных вымрнікаў... «мабілізаваўшы творчасьць і ініцыятыву рабочых мас на гэтую справу".

Гэтая частка пастановы бальшавіцкага ЦК па дакладу начальніка 6-га раёну чыгуначнымі арганізацыямі Віцебску не ажыцьцяўлёна.

Парткамітэты, дабіўшыся некаторага зруху ў сваёй практычнай рабоце па мабілізацыі актыўнасьці мас на барацьбу за аздараўленьне транспарту, ня зьнішчылі тую недысцыплінаванасьць, недахопы, якія існавалі ў паасобных ячэйках. На рашаючых вучастках работ не ведаецца адказнасьці партыйцаў.

Зараз канчаецца месячнік праверкі работы чыгуначнага транспарту. Віцебскія чыгуначнікі не дабіліся патрэбных вынікаў па выкананьню вымрнікаў. Якасьць рамонту паравозаў, цянікоў па раскладу ганебна адстаюць ад трабаваньняў, якія прад'яўляюцца грузапатокам асеньня-зімовых перавозак.

Галоўным віноўнікам невыкананьня вымрнікаў зьяўляецца нядбайная і дезадказная работа паасобных гаспадарчых зьвеньняў і паравозных брыгад.

Камуністыя чыгункі разам з перадавымі ўдарнікамі павінны рашуча мабілізавацца на зьнішчэньне ўсіх недахопаў, на падняцьцё працдысцыпліны, па бальшавіцку змагацца за выкананьне вымрнікаў.

НЯМА РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ЗДАРОВЫ ПАРА

За апошнія дні процант хворых паравозаў у дэпо ст. Віцебск зноў павялічыўся. Пры норме ў 17 проц. ён 14 га кастрычніка дасягнуў 23,6 проц. Нядбайнасьць, нізкая працдысцыпліна паравозных брыгад, нераспараджальнасьць і безадказная работа дзяжурных па дэпо, абязьлічаны рамонт—усё гэта галоўнае што садзейнічала павялічэньню процанту хворых паравозаў.

Па відах рамонту процант хворых паравозаў не павінен правышаць наступных лічбаў:

Від рамонту	Задана ў проц.	Складае ў проц.
Прамыўка	9	9,5
Абточка	2	2
Завадзкі рамонт . .	3	6
Іншыя віды	2,9	5,3

Прыведеныя лічбы паказваюць, што толькі цэх абточка ўкладаецца ў заданую норму і ня трымае паравозы звыш паложанага часу. Несваечасовы выпуск паравозаў з завадзкога рамонту і вялікі процант міжпаравознага рамонту працягвае заставацца адным з хваробных зьяў цэху.

Нераспараджальнасьць дзяжурных па дэпо і ўсё яшчэ дрэнная работа агульнага складу выклікае вялікі перастой паравозаў пад экіпіроўкай. Да 9-ці гадзін перастайваюць паравозы ў міжпаравозным рамонце (№№ 5501, 59, 58 і інш.).

За апошні час з-за нізкай працдысцыпліны і нядбайнасьці паасобных паравозных брыгад выйшла са строю шмат паравозаў. Так, 13 га лістапада машыністы **Ладнёў**, зварочваючыся з цягніка па няправільнаму ленінградзкаму шляху, уехаў у бок цягніку, выбіўшы са строю паравоз **О—6177** на двое сутак. Паламана пяць вагонаў. Гэта аварыя затрымала рух цягнікоў па ленінградзкаму шляху на 6 гадзін. 15-га лістапада машыністы **Буевіч** на ст. Заольша выбіў са строю паравоз **Щ—6026**, машыністы **Мартееў** на паравозе **Щ—5504** выплавіў буксу. 16 га лістапада на вугальным складзе на стаячы паравоз **Щ—2004** на скачыў паравоз **Э—4377**, які вёў машыністы **Корсак** і ў выніку два паравозы выйшлі са строю на трое сутак, прынёсшы страту па рамонту на 530 руб. **Кожны выбіты са строю паравоз павялічвае процант хворых на 0,7 проц.**

Пастаноўка работы ў дэпо не забясьпечвае добраякасны рамонт паравозу. Цэхі і паасобныя групы рабочых ня маюць пляну. У аўтагенай інструменты абязьлічаны. У паасобным цэху кваліфікаваныя рабочыя выконваюць працу чорнарабочых (пераноска дэталяў і інш.). У такарным цэху ня зьнішчана няправільная расточка падшыпнікаў (аднаго на дваі м.м., другога на выклікала затрымку выпуску паравозу **Э—6025** на 4 гадзіны адзначыць, што ў складзены бракаваных дэталяў чаюць прозьвішчы вінаў інструктары ФЗВ наўважносяцца да нагляду за работняў, якія вырабляюць дэталі мантуемых паравозаў. Так, кантрольнасьці інструктара ва, вучні Нэйдлін, Казлоў і вывалілі край грушавага Папсаваўшы дэталь, яны зазвыпуск паравозу з прамываномонту на 8 гадзін.

Перад адпраўкай паравоза вадзкі рамонт, запаўненьне ных ведамасьцей вытвараецважліва. Адсутнічае цьвёрдроль пры прыёмцы паравозаніку чаго прыбываючыя маюць па 15 і больш элемэндатковага рамонту.

Усе гэтыя факты сведчатым, што якасьці рамонту пане ўдзяляецца дастаткова ў боку паравозных брыгад нямдарчага догляду і бясьпечнахоўваньня паравозаў.

Трэба абвясьціць рашучую бу разьгільдзяйству і абязьлічмаюцца як у рабоце дэпо, тарод паравозных брыгад.

Гр. Макс

Дыспэтчарскі апарат працуе нядбайна

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б: «**да 25-га кастрычніка зрабіць рашучы пералом у часьці сьледваньня цягнікоў па раскладу шляхам своечасовай выдачы паравозаў пад цягнікі, асабліва па дэпо Віцебск**»—яшчэ ня выканана.

6-ы эксплёатацыйны раён, які мае вялікія прарывы ў выкананьні асноўных вымрнікаў, яшчэ і сёньня не забясьпечыў бесьперабойную работу паасобных вучасткаў транспарту.

Несваечасовы рух цягнікоў па раскладу зьяўляецца адным з хваробных месц у рабоце раёну. 39 процантаў сьледваньня таварных цягнікоў за другую пяцідзёну лістапада—ганебная лічба. Вытвараны аналіз аддзелам эксплёатацыі раёну прычын несваечасовага руху паказвае, што адпраўленьне цягнікоў са спазьненьнем падае ў значнай ступені на цягу.

Адсутнасьць чоткасьці ў рабоце дыспэтчарскага апарату і дзяжурных па дэпо, аглядчыкаў і іншых катэгорый, затрымліваюць рух цягнікоў.

Вось шэраг фактаў, паказваючых нядбайную работу. 10-га лістапада цягнік № 786 спазьніўся звыш гадзіны з прычыны дрэннага агляду цягніка аглядчыкамі ст. Магілёў і змазчыкамі віцебскага рэзэрву, з-за чаго ў Шклове прышлося адцапляць вагон, у якім перагарэла букса. 11-га лістапада цягнік № 773, які вёў машыністы Янкоўскі, спазьніўся на 11 гадз. 17 хвіл. З гэтай прычыны хуткі № 81 пайшоў па няправільным шляху.

Усё гэта прывяло к таму, што былі выбіты з раскладу цягнікі № 777, 783, 749 і 987, якія спазьніліся на 25 гадзін. Машыністы цягніка № 778 Гарбароў вывёў з раскладу пяць цягнікоў таму, што на перагоне Віцебск—Мядзведзі дастаўляў цягнік па частках. З боку паасобных машыністых нагледаюцца злачынна-нядбайныя адносіны да сваёй работы. Так, 12 га лістапада машыністы Літвінаў, сьледуючы з цягніком № 724, праехаў месца набору вады (ст Выдрэя) і толькі ў Лёзьне ўспомніў, што ў паравозе няма вады. Паравоз быў адцэплены ад цягніка і накіраваны ў Выдрэю для набору вады, У выніку—цягнік спазьніўся на 2 гадз. 49 хвіл., выклікаўшы сваім прастоем затрымку яшчэ 5-ці цягнікоў.

Наглядаюцца затрымкі цягнікоў з боку агентаў станцыі. Так, цягнік № 782 быў затрыманы па віне ст. Віцебск на 50 хвілін.

У рабоце дыспэтчарскага апарату ня толькі адсутнічае чоткасьць, але часам нагляда юцца зусім недапушчальныя і злачынныя распараджэньні. Так, дыспэтчар загадам № 920 указаў машыністаму цягніка № 920 сьледваць на адлегласьць 156 клм. без набору вады ў напрамку Полацак—Апочка. 14-га лістапада цягнік № 750, які шоў з Магілёву, прайшоў міма Воршы да ст. Мажаеўка, з якой быў зьвернуты дыспэтчарам ст. Ворша для разборкі. Падобныя факты не адзіны.

13-га лістапада агульнае спазьненьне цягнікоў па 6-му раёну дасягнула 135 гадзін.

Рашучых мер барацьбы супроць нядбайнай работы паасобных працаўнікоў, якія затрымліваюць цягнікі, не вядзецца. З боку ДТ—Віцебск, які нясе асабістую адказнасьць за своечасовае расьсьледваньне і рэагаваньне на кожны выпадак парушэньняў і злоўжываньняў—наглядаецца цяганіна. Справы аб разрывах цягнікоў у дарозе: № 773—6 жніўня, 776—2 ня 616—10 верасьня, 9 верасьня і інш. дагэтуль нерозгледжаныя. 123 розных выпадкаў і здаляжаць без разгляду і заньня па дэпо Віцебск. час, як на расьсьледваньне нага выпадку дапускаецца больш 10 дзён, яны ў Д трымліваюцца звыш 3 х цаў. Накладзенае адміністнае спагнаньне загадам № на ДТ—Віцебск за несвае рэагаваньне на здарэнпаслужыла апошняму ўро

З паказаных фактаў што нядбайныя адносіны ных работнікаў агляду змазчыкаў, паравозьнікаў пэтчараў і агентаў станцыі іх абавязкаў ствараюць шт на па 100 і больш гадзін стою цягнікоў з-за несвавага іх адпраўленьня. Дчарскі апарат з прычыны малакваліфікаванасьці і ня насьці пры здарэньні ці заікі цягніка ў дарозе не дакіх распараджэньняў для шчэньня пуці, каб даць мамасьць наступным цягнікам часова сьледваць.

Сі

Ударыць па вялікадзяржаўных шавіністах

Пазбавіць дзяржфатаграфію ад людзей, чуждых рабочай клясе

16-га лістапада на агульным сходзе працаўнікоў фотаграфіі Белдзяржкіно абгаварвалася пытаньне аб недапушчальных паводзінах невялічкай групы былых «хазяйчыкаў», якія разлагаюць калектыў сваімі антысавецкімі разважаньнямі.

Пасьля доўгіх спрэчак, у якіх гэтая група, у асобе Макоўскага, Мірмовіча і інш. ўхітрылася выступаць па 5—6 раз з розымі хлусьлівымі абвінавачаньнямі супроць партыі і ўраду, на прапанову старшыні групкому тав. Кагана рэзка асудзіць гэтую групу, Макоўскі і кампанія дабіліся таго, што некаторая частка сходу не падтрымала рэзалюцыю, патрабуючую ўжыцьця суровых мер проці асоб, разлагаючых калектыў фатаграфіі.

Аб чым гаварылі раз'юшыўшыяся «хазяйчыкі»?

Макоўскі заяўляе: „нам беларусізацыя непатрэбна, мы ўсе раз'едземся". Мірмовіч паўтарае за ім: „мы жывём далёка ад установы і ня можам займацца беларускай мовай". І дадае: «раней пры хазяевах ляпей жылося, бо бруха было сытае». Ліўшыц, паддаўшыся ўплыву гэтых клясавых ворагаў, нахабна заяўляе: «для чаго чаць белмову, у Ленінгранас гэтага не патрабуюць». рэйшы здымшчык Хейн заяўляе «а што нам зробяць, ка будзем вучыцца белмове».

Адносіны да беларусізацыі калектыве з боку гэтых ла самыя варожыя, пры чым рактэрна, што паказаныя праводзяць у гэтых адно двурушніцкую палітыку. Гаюць за актыўнае наведва гуртку, а на справе не н ваюць яго (Салавей, Левіна хадроў і інш.). Увесь ратускі цэх знаходзіцца пад у вам Макоўскіх і Мірмо якія праяўляюць у штодзённым рабоце рвацтва і недапушчаныя адносіны да вытворча Ударніца Купрычэнка гал за прапанову Макоўскага ліць асуджаючую іх рэзалю Такую «актывістку» трэба г з шэрагаў ударнікаў.

Што Макоўскі і «Ко» вя разлагаючую работу, відаць таго, што на сходзе яны а валі тых, хто крытыкаваў паводзіны, «клеветнікамі» і жымшчыкамі".

Трэба неадкладна пазбавіць дзяржфатаграфію ад людзей чуждых рабочай клясе?

...а 10-га сьнежня—100% фінпляну 4 кварталу

...АБРЫКА „ПРАФІНТЭРН", ПАКАЗАЎШАЯ БЛІСКУЧЫЯ ПРЫКЛАДЫ ВЫКАНАНЬНЯ ...ІНПЛЯНУ—ПАВІННА БЫЦЬ БУКСІРАМ. КААПЭРАЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЯ ...ГУЦЬ І НЕ ПАВІННЫ ЗАСТАВАЦЦА Ў ГЛЫБОКІМ ТЫЛЕ ВЫКАНАНЬНЯ ФІНПЛЯНУ

У 22 дні выканаць фінплян 4-га кварталу

